Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# Справаздача Каардынацыйнага камітэта Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (2013-2014)

Падрыхтавана да Канферэнцыі БНП
“Беларусь ва ўмовах рэгіянальнага крызісу
і стагнацыі Усходняга партнёрства”,
Мінск, 21 чэрвеня 2014 году

Склад Каардынацыйнага камітэта БНП, які дзейнічаў у 2013-2014 гг:

- Улад Вялічка – старшыня
- Андрэй Ягораў – дзеючы нацыянальны каардынатар
- Сяргей Мацкевіч
- Пётр Кузняцоў
- Аксана Шэлест
- Яраслаў Бекіш
- Аляксандр Валчанін

Ганаровы сябра Каардынацыйнага камітэту – Алесь Бяляцкі

## Змест


Дзейнасць Каардынацыйнага камітэта за 2013-2014 год....2
Мэты і задачы дзейнасці КК у 2013-2014 гг. ....2
Актуальны склад БНП....3
Сустрэчы Каардынацыйнага камітэта....3
Еўрапейскі дыялог па мадэрнізацыі....3
Дзейнасць у межах агульна-Форумнага праекта па развіцці Нацыянальных платформаў....4
Рэгіянальная актыўнасць ....4
Актыўнасць у Беларусі ....5
Іншыя ініцыятывы і дзеянні ў межах БНП за апошні год....8
Заявы, звароты і пазіцыі БНП ....8
Рэакцыя БНП на падзеі ва Ўкраіне....9
Працоўная сустрэча з прадстаўнікамі Армянскай НП ....10
Высновы, рэкамендацыі, прапановы: перспектывы і выклікі для далейшай дзейнасці БНП....11
Усходняе парнёрства ....11
Унутраная сітуацыя ў Беларусі ....11
Актуальны стан Беларускай нацыянальнай платформы ....12
Прыярытэты....12

## Дзейнасць Каардынацыйнага камітэта за 2013-2014 год

### Мэты і задачы дзейнасці КК у 2013-2014 гг.

На сваіх першых сустрэчах Каардынацыйны камітэт вызначыў кола сваіх прыярытэтных задач на год наступным чынам:

А. Беларуска-еўрапейскія адносіны, выкарыстанне інструментаў еўрапейскіх праграм і еўрапейскай палітыкі для дасягнення нашых мэтаў:

• Далейшая праца з пераструктураваннем ЕДМ, увядзенне стейкхолдэрскага кампаненту;
• Да Форуму ФГС УП у Кішынёве - распрацоўка дакументу пра актуальны стан Нацыянальных платформаў;
• Пашырэнне інфармавання ўдзельнікаў БНП аб еўрапейскіх працэсах і праграмах;
• Выкарыстанне інфраструктуры ФГС УП - правядзенне 2-3 мерапрыемстваў сумесна на ўзроўні Нацыянальных платформаў краін УП;
• Арганізацыя наступнай Канферэнцыі НП ў перыяд паміж Форумам ГА і саміта УП.

Б. Самавызначэнне НП і развіццё адносін унутры яе:

• Акрамя вырашэння тактычных задач, зразумець і больш выразна пазначыць прызначэнне і спецыфіку БНП і Каардынацыйнага камітэту;
• Распрацаваць больш выразную палітыку далучэння да працы НП, увесці новыя формы ўзаемадзеяння і камунікацыі паміж КК і арганізацыямі-удзельнікамі НП.

В. Перспектыўныя для запуску ў Беларусі працэсы:

- Прадумаць і скласці прапановы ў фармаце «дарожных карт» для «прота-нацыянальных» праграм, у прыватнасці:

  1. «Рэгіянальная праграма». Задачы: «спроба пераадолець хаос рэгіянальнага развіцця», прыўнясенне пытанняў полісі на рэгіянальны ўзровень. Акрамя гэтай асноўнай задачы, запуск рэгіянальнай праграмы павінен вырашаць і шэраг іншых, якія з'яўляюцца, зыходзячы з актуальных патрэбаў (напрыклад, павышэнне ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці рэгіяналаў ў працы з еўрапейскімі праектамі).

  2. Праграма «Фарміравання грамадскай думкі» або «Прасоўвання еўрапейскіх нормаў у Беларусі».

- Сфакусаваць энергію гэтага года на 2-3 наяўных ініцыятывах па тэматызмах ЕДМ.

Вялікая ўвага працы КК і БНП была нададзена пытанням узаемадзеяння ў межах Форуму грамадзянскай супольнасці і перефарматаванню Еўрапейскага дыялогу па мадэрнізацыі. На жаль, вынікі працы досыць супярэчлівыя. З аднаго боку, удалося арганізаваць кампетэнтны ўдзел БНП у пятай сустрэчы Форума ў Кішынёве, адпаведную зваротную сувязь па самой сустрэчы і каментары да праекта стратэгіі Форума, забяспечыць удзел прадстаўнікоў беларускай грамадзянскай супольнасці на мерапрыемствах, якія праходзілі паралельна з трэцім Самітам Усходняга партнерства ў Вільні (лістапад 2013). З другога боку, усе намаганні па перафарматаванні ЕДМ у адпаведнасці з прынцыпамі шматбаковага і роўнага дыялогу зацікаўленых бакоў у выніку пацярпелі няўдачу (гл. ніжэй).

У выніку працы на працягу года ў найбольшай ступені КК удалося ўпарадкаваць шэраг пытанняў унутранага функцыявання БНП. У прыватнасці, быў распрацаваны і

запушчаны сайт БНП (http://npbelarus.info), прынятае Палажэнне аб выкарыстанні і мадэрацыі публічнай рассылкі БНП, Палажэнне аб прынцыпах інфармацыйнага супрацоўніцтва паміж сайтам Беларускай Нацыянальнай платформы ФГС УП і інфармацыйнымі рэсурсамі арганізацый-удзельнікаў БНП. Арганізацыі-удзельнікі БНП атрымалі магчымасць правядзення шэрагу мерапрыемстваў пад эгідай БНП па канкрэтных пытаннях парадку дня Усходняга партнерства (2 серыі мерапрыемстваў у 2013 і 2014 гг.).

У той жа час вялікая колькасць з гэтых планаў па розных прычынах не змагла быць рэалізаваная. У прыватнасці, так і не ўдалося рэалізаваць планы па фармаванні і запуску нацыянальных праграм (рэгіянальная, праца з грамадскай думкай). Далёка не ў дастатковай ступені ўдалася прыцягнуць новыя арганізацыі да супрацоўніцтва ў межах БНП, вялікая колькасць мерапрыемстваў у межах праекта па развіцці Нацыянальных платформ рабілася больш у інтарэсах саміх арганізацый, чым сапраўды дапамагала праз гэта ўмацоўваць сувязі і экспертны патэнцыял на базе БНП. Сярод асноўных прычынаў такой сітуацыі можна назваць наступныя:

- Стагнацыя самой ініцыятывы Усходняга партнёрства з-за неадпаведнага ўзроўню ўдзелу, а часам і дэмарша з боку шэрагу краін-удзельніц (Арменія, Азербайджан, Беларусь);
- Інтэнсіўны і шматузроўневы крызіс ва Ўкраіне, які закрануў рэгіён УП, еўраструктуры і грамадзянскую супольнасць;
- Незацікаўленасць і перасцярогі ў супрацоўніцтве з БНП з боку Дэлегацыі ЕС у Беларусі, нізкі ўзровень успрыняцця прапановаў БНП еўрачыноўнікамі з Брусэлю;
- Занятасць сябраў КК у сваіх арганізацыях і няздольнасць працаваць пра-актыўна ў неспрыяльных умовах;
- Нізкая актыўнасць і малаініцыятыўнасць удзельнікаў БНП.

### Актуальны склад БНП

На сёняшні дзень колькасць сталых удзельнікаў БНП складае 68 арганізацый, такім чынам колькасць у параўнанні з мінулым годам павялічылася на 3 арганізацыі.

### Сустрэчы Каардынацыйнага камітэта

За справаздачны перыяд дзейнасці КК адбылося 7 паўнавартасных сустрэч сябраў Каардынацыйнага камітэту (чатыры ў 2013 годзе і тры – у 2014 годзе). Большасць з сябраў КК актыўна прымала ўдзел у сустрэчах, ніхто не ігнараваў гэты важны інструмент каардынацыі дзейнасці і па магчымасці рабіў свой унёсак. Па выніках сустрэчы прымаліся рашэнні і вызначаліся адказныя, гэты механізм нясення адказнасці спрацоўваў здавальняюча, але недастаткова эфектыўна. Менавіта таму, разам з іншымі прычынамі, шэраг прынятых рашэнняў і вызначаных планаў так і не быў рэалізаваны.

Парадак дня сустрэчаў КК быў досыць шырокім: ад вызначэння прыярытэтаў і планаў дзейнасці да падрыхтоўкі канкрэтных пазіцый і ўдзелу прадстаўнікоў БНП у міжнародных мерапрыемствах (у межах УП, але не толькі). Кожная з сустрэчаў афармлялася адпаведным пратаколам, аб выніках сустрэчы ўдзельнікі БНП рэгулярна інфармаваліся праз дзеючую рассылку БНП. Наступны склад КК атрымае ўсю дакументальную і пратакольную базу працы КК за апошнія 2 гады.

### Еўрапейскі дыялог па мадэрнізацыі

На працягу апошняга года КК БНП вёў актыўную працу па абмеркаванні з зацікаўленымі бакамі альтэрнатываў для развіцця Еўрапейскага дыялогу па мадэрнізацыі з беларускім грамадствам, як адной з важных ініцыятываў, якая ў камбінацыі з Усходнім партнёрствам можа аказаць істотны ўплыў на развіццё беларуска-еўрапейскіх стасункаў. КК, як і ў мінулы год, знаходзіўся ў пісьмовай камунікацыі з афіцыйнымі прадстаўнікамі

ЕС, прапануючы свой падыход да развіцця ЕДМ, дзе істотная роля адводзіцца грамадзянскай супольнасці як аднаму з зацікаўленых бакоў. На жаль, рашэнні, прынятыя з боку ЕС, фактычна канстатуюць абранне іншага шляху развіцця ЕДМ і перавядзенне яго ў “экспертна-праектны” фармат замест фармату “круглага стала зацікаўленых бакоў”. У выніку ЕДМ губляе патэнцыял істотнага залучэння ў гэтую ініцыятыву шырокага кола грамадскіх арганізацый і іх мэтавых групаў. У якасці пэўнай кампенсацыі прадстаўнік БНП уключаны у Раду праекта, які зараз будзе мець назву “РЭФОРУМ” і адміністравацца Беларускім інстытутам стратэгічных даследванняў. Арганізатары абяцаюць прыняць да увагі меркаванні грамадзянскай супольнасці праз шэраг сацыялагічных апытанняў і арганізацыю своеасаблівых сектарных форумаў, але не гатовыя бачыць БНП у якасці замоўцы такой працы. Такую ж пазіцыю выказала і Дэлегацыя ЕС у Беларусі, падтрымаўшы пазначаны фармат.

## Дзейнасць у межах агульна-Форумнага праекта па развіцці Нацыянальных платформаў

Частка актыўнасці Беларускай нацыянальнай платформы адбывалася ў межах праекта па развіцці Нацыянальных платформаў краінаў Усходняга партнёрства, які быў падтрыманы Еўрапейскай камісіяй. Праект складаецца з дзвюх асноўных частак: рэгіянальнай актыўнасці, дзе задзейнічаны некалькі краінаў УП, і адмысловай актыўнасці асобна для кожнай краіны.

### Рэгіянальная актыўнасць

У 2013 годзе было ініцыяванае правядзенне рэгіянальнага маніторынгу і ацэнкі выканання дарожнай мапы Усходняга партнёрства да Саміта Усходняга партнёрства ў Вільнюсе ў лістападзе 2013. Маніторынг каардынавала міжнародная даследчая арганізацыя PASOS. З беларускага боку ў падрыхтоўцы маніторынгу ўдзельнічалі эксперты Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі і Асамблеі НДА.

У маніторынгу прадстаўленая ацэнка выканання дарожнай мапы ў кантэксце Беларусі і беларускай сітуацыі. Супраца з дзяржавай, структурамі Еўрапейскай камісіі, іншымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці была прааналізаваная ў фокусе ўплыву на распрацоўку палітыкі, развіццё ўнутрысектарнага і міжсектарнага дыялогу, дыялогу на дзяржаўным узроўні і інш. На двубаковым і шматбаковым узроўнях была прааналізаваная рэалізацыя самой дарожнай мапы Усходняга партнёрства у 2012–2013 гг. Па выніках даследвання быў падрыхтаваны і прадстаўлены ў адкрытым доступе дакумент маніторынгу.

У межах рэгіянальнага кампанента 17-18 сакавіка 2014 г. адбылася паездка прадстаўнікоў Беларускай нацыянальнай плафтормы ў Брусэль, дзе адбыліся сустрэчы ў офісе Еўракамісара Фюле і ў сакратарыяце Форума грамадзянскай супольнасьці. Павестка дня сустрэчаў уключала ў сябе такія пытанні як агульная ацэнка стану справаў ва Усходнім партнёрстве і яго перспектывы, украінскі крызіс і яго ўплыў на рэгіён, сітуацыя ў НП, праграмы Еўрапейскага Саюза для Беларусі, месца ў іх грамадзянскай супольнасці і іншыя.

У траўні 2014 года прадстаўнік Беларускай НП быў накіраваны на выбары Прэзідэнта Украіны дзеля экспертнай ацэнкі магчымага ўплыву ўкраінскіх падзеяў на сітуацыю ў Беларусі, у рэгіёне і на перспектывы Ўсходняга партнёрства з асаблівым акцэнтам на ролю грамадзянскай супольнасці.

## Актыўнасць у Беларусі

### *Web-сайт БНП*

У кастрычніку 2013 г. быў запушчаны адмысловы вэб-сайт http://npbelarus.info/, прысвечаны праграме “Усходняе партнёрства” і Беларускай нацыянальнай платформе, у прыватнасці. На сайце рэгулярна змяшчаюцца актуальныя навіны і абвесткі пра значныя падзеі, звязаныя з рэгіёнам і з беларускай грамадзянскай супольнасцю, а таксама з палітыкай ЕС у дачыненні да краін УП. Сайт максімальна адлюстроўвае дзейнасць Беларускай нацыянальнай платформы, на ім рэгулярна змяшчаюцца заявы і звароты ад БНП, што дазваляе больш шырока распаўсюджваць гэтую грамадска значную інфармацыю.

### *Інфармацыйныя матэрыялы*

Акрамя ўдзелу ў падрыхтоўцы маштабнага маніторынгу дарожнай мапы УП, Беларуская нацыянальная платформа падрыхтавала да Пятага Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, які праходзіў 4-5 кастрычніка 2013 г., інфармацыйную брашуру пра дзейнасць арганізацый-удзельнікаў БНП. Брашура ўтрымлівала справаздачу аб дзейнасці БНП за мінулы перыяд і пра будучыя планы. Размяшчэнне кароткай інфармацыі пра кожную з арганізацый-удзельніц Пятага Форума ад Беларусі дазволіла прадставіць беларускую дэлегацыю і паспрыяць усталяванню далейшай партнёрскай камунікацыі, паколькі ўтрымлівала, у тым ліку, кантактныя звесткі. Брашура была цалкам распаўсюджаная падчас Форума сярод іншых удзельнікаў з краін рэгіёну і ЕС.

У мэтах прамоцыі Усходняга партнёрства і Беларускай нацыянальнай плятформы быў выраблены календар-планіроўшчык на 2014 год, які быў бясплатна распаўсюджваны сярод удзельнікаў НП, а таксама іншых беларускіх НДА.

### *Канфэрэнцыі НП*

Канферэнцыі Нацыянальнай платформы з’яўляюцца ключавым камунікацыйным фарматам у межах Нацыянальнай платформы, яны дазваляюць яе арганізацыям сабрацца разам для фармавання агульнай павесткі і абмену вопытам і меркаваннямі. 16 лістапада 2012 года падчас другой канферэнцыі НП была прынятая “Канцэпцыя развіцця Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (2012-2014)”.

У 2013 годзе мелі месца дзве адмысловыя канферэнцыі. Першая з іх адбылася 1 чэрвеня і мела выбарчы характар: быў абраны новы Каардынацыйны камітэт і яго старшыня, прынятыя некалькі рэзалюцый і канчатковы вырашаныя тэхнічныя пытанні, такія як фармат удзелу анлайн-ініцыятыў, некаторыя аспекты прыняцця новых сябраў, мадэраванне адмысловай электроннай расылкі і г.д. У канферэнцыі, якая мела назву “Паміж Усходнім партнёрствам і Еўрапейскім дыялогам па мадэрнізацыі” прынялі ўдзел 91 прадстаўнік арганізацый грамадзянскай супольнасці і СМІ.

Другая канферэнцыя Беларускай нацыянальнай платформы пад назвай "Будучае Форума грамадзянскай супольнасці ў фокусе трэцяга Саміта Усходняга партнёрства" праводзілася 4 лістапада 2013 г. і была прысвечаная падвядзенню вынікаў мінулай Пятай сустрэчы Форуму ў Кішынёве і абмеркаванню будучыні самой ініцыятывы, а таксама рэсурсаў і магчымасцяў Беларускай нацыянальнай платформы ў прасоўванні еўрапейскіх прынцыпаў і каштоўнасцяў, у развіцці дэмакратычна-арыентаванай грамадзянскай супольнасці Беларусі і ўзмацненне ролі Беларусі ў рэгіёне і на міжнароднай арэне. У канферэнцыі прынялі ўдзел 78 прадстаўнікоў арганізацый грамадзянскай супольнасці і СМІ.

## *Экспертныя і рабочыя сустрэчы*

Важным кампанентам праекта, які дазваляе развіваць непасрэдна арганізацыі грамадзянскай супольнасьці і іх кампэтэнцыі, з'яўляюцца экспертныя і рабочыя сустрэчы. У 2013-2014 гг. адбыўся шэраг круглых сталоў і экспертных сустрэч па тэматычных пытаннях, а таксама некалькі арганізацыйных сустрэчаў удзельнікаў НП дзеля фармавання агульнай беларускай пазіцыі па ключавых пытаннях напярэдадні мерапрыемстваў Форума грамадзянскай супольнасці.

*Рабочая група 1*

Праблема свабоды слова і выказванняў, свабоды распаўсюду інфармацыі з'яўляецца вельмі актуальнай для сучаснай Беларусі. Непасрэдна таму, 3 траўня 2013 г. у сусветны дзень свабоды друку пры супрацы з Беларускай асацыяцыяй журналістаў была праведзеная экспертная сустрэча па тэме "Перспектывы рэфармавання медыя сферы. Што можа быць зробленае журналісцкай супольнасцю?". На сустрэчы быў прадстаўлены аналіз заканадаўства ў кантэксце медыя, акрэсленыя асноўныя праблемы і перашкоды, што стаяць на шляху дзейнасці сучасных незалежных беларускіх СМІ. Як адная з паспяховых мераў пераадольвання існуючых праблем былі прадстаўленыя школы для маладых і для прафесійных журналістаў. Адным з асноўных момантаў сустрэчы было прадстаўленне тагачасных вынікаў рэгіянальнага сумеснага праекта некалькі краін рэгіёну ў межах Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, па якім быў падрыхтаваны адмысловы і дэтальны аналіз сітуацыі са СМІ ў рэгіёне і распрацаваныя рэкамендацыі.

Асамблея НДА сумесна з Цэнтрам прававой трансфармацыі звярталіся ў Парламент з прапановай правядзення грамадскіх слуханняў адносна ўнясення зменаў у некаторыя законы, датычныя дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Прапанова была адхіленая, у адказ на гэта было ініцыявана правядзенне грамадскіх слуханняў на пляцоўцы 1 рабочай групы. У слуханнях, якія адбыліся 9 кастрычніка 2013 г., бралі ўдзел эксперты ў галіне прававога рэгулявання дзейнасці недзяржаўных і некамерцыйных арганізацый і прадстаўнікі недзяржаўных грамадскіх арганізацый. На мерапрыемстве былі прадстаўленыя вынікі аналіза заканадаўства і адбылося яго абмеркаванне. У сваю чаргу, вынікі абмеркавання разам з прапановамі па рэфармаванні заканадаўства былі накіраваныя ў Парламент, была запланаваная распрацоўка мапы рэфармавання заканадаўства з улікам інтарэсаў грамадскіх аб'яднанняў.

У лістападзе 2013 г. адбылася рэгіянальная сустрэча па ініцыятыве Гомельскага дэмакратычнага форуму. Сустрэча была прысвечаная папулярызацыі праграмы Усходняе партнёрства ў рэгіёнах Беларусі, распаўсюду актуальнай і карэктнай інфармацыі пра праграмы і пазіцыю Еўрапейскага саюза ў дачыненні Беларусі, актуалізацыі еўрапейскіх каштоўнасцяў у кантэксце беларускай сітуацыі.

16 красавіка 2014 г. пры падтрымцы Асамблеі НДА адбыўся круглы стол "Канфліктагеннасць моўнай сытуацыі ў Беларусі ў новых геапалітычных умовах і досвед Еўрапейскага звяза". Вядомыя мовазнаўцы і грамадскія дзеячы абмеркавалі міжнароднае моўнае права, неабходнасць вяртання беларускіх НДА да працы над Усясветнай дэкларацыяй лінгвістычных правоў, а таксама падтрымалі ініцыятыву аб звароце ў Канстытуцыйны суд з просьбай узбудзіць вытворчасць па справе аб выдаленні ў заканадаўстве аб мовах прабелаў, выключэнні ў ім калізіяў і прававой нявызначанасці.

*Рабочая група 2*

У супрацы з Рэспубліканскай канфедэрацыяй прадпрымальніцтва (РКП) 25 верасня 2013 г. прайшоў круглы стол, прысвечаны праблематыцы працоўных рэсурсаў для

бізнэса і ролі бізнэс-асацыяцый і НДА у вырашэнні гэтай праблемы. У мерапрыемстве бралі ўдзел шматлікія прадстаўнікі дзяржаўных структур, у тым ліку Міністэрства працы, бізнэс-арганізацыі і НДА, кожныя з якіх рабілі прэзентацыю свайго бачання праблемы і прапановаў па яе вырашэнні. У выніку мерапрыемства, скарыстаўшыся матэрыяламі дыскусіі і прэзентацый, групай экспертаў-удзельнікаў мерапрыемства была падрыхтаваная аналітычная праца па стану і праблемах працоўных рэсурсаў у Беларусі.

*Рабочая група 3*

У межах трэцяй рабочай групы ФГС УП 21 чэрвеня 2013 г. быў арганізаваны круглы стол па пытаннях рэалізацыі ў Беларусі Орхускай канвенцыі. У сустрэчы прынялі ўдзел лепшыя эксперты НДА ў гэтай галіне, прадстаўніца Орхускага цэнтра ў Беларусі і прадстаўніца праграмы ПРААН у Беларусі, якая займаецца рэалізацыяй праекта, наўпрост звязанага з маніторынгам выканання Канвенцыі. У тым ліку, было ўзнятае пытанне будоўлі Беларускай АЭС і яе супярэчлівай ацэнкі афіцыйнымі экспертамі, у тым ліку ў кантэксце Орхускай канвенцыі.

Базуючыся на выніках экспертнага абмеркавання былі распрацаваныя і накіраваныя ў адпаведныя ўладныя структуры прапановы па ўдасканаленні дзейнасці грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета пры Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы грамадскага асяроддзя.

*Рабочая група 4*

25 верасня 2013 г. беларускім нацыянальным моладзевым саветам “РАДА” быў праведзены круглы стол па рэалізацыі ў Беларусі моладзевай палітыкі. Радай у супрацы з экспертам-юрыстам быў падрыхтаваны падрабязны аналіз заканадаўства ў кантэксце моладзевай палітыкі. У сустрэчы брала ўдзел прадстаўніца міжнароднай арганізцыі International Centre for Not-for-Profit Law, якая падзялілася сваім вопытам і бачаннем шляхоў рэфармацыі моладзевай палітыкі ў Беларусі. Сустрэча стала адпраўной кропкай да далейшай працы моладзевых недзяржаўных арганізацый Беларусі над аналізам іх асяроддзя і распрацоўкай адпаведных рэкамендацый па рэфармаванні.

У лістападзе-снежні 2013 г. адбыліся 2 сустрэчы прадстаўнікоў арганізацый, якія займаюцца праблемамі людзей сталага ўзросту і пенсійным заканадаўствам. На аснове аналізу прававога стану па дадзеным пытанні ў Беларусі і ў краінах-суседзях былі акрэсленыя асноўныя прапановы па ўнясенні зменаў у адпаведныя заканадаўчыя аспекты ў Беларусі.

У сакавіку 2014 адбылося мерапрыемства, прысвечанае абмеркаванню прававога становішча беларускай мовы. У сустрэчы бралі ўдзел вядомыя эксперты па моўным пытанні, удзельнікам быў прэзентаваны дэталёвы аналіз развіцця стану беларускай мовы ў палітычным і культурным кантэкстах. Юрыстам БХК была прадстаўленная да абмеркавання канцэпцыя прасоўвання беларускай мовы - праект дакумента для звароту ў Канстытуцыйны суд. Таксама было прынятае рашэнне аб стварэнні моўнай камісіі пры ўдзеле вядучых грамадскіх арганізацый.

*Рабочая група 5*

18 красавіка 2013 г. па ініцыятыве Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальнікаў (РКП) быў праведзены круглы стол па тэме “Развіццё сацыяльнага партнёрства. Прававыя межы і стрымліваючыя абмежаванні”. На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі бізнэс-асацыяцый, прафсаюзаў і недзяржаўных арганізацый, а таксама прадстаўнікі дзяржаўных структур, што займаюцца пытаннямі працоўнага заканадаўства. Упершыню такім максімальна шырокім у сваёй рэпрэзентатыўнасці складам былі абмеркаваныя

праблемы, якія ўзнікаюць у супрацы бізнэса, дзяржавы і недзяржаўных структур і перашкоды, якія паўстаюць на шляху развіцця канцэпцыі сацыяльнага партнёрства ў Беларусі. Па выніках сустрэчы група экспертаў падрыхтавала дэталёвы аналіз рэалізацыі сацыяльнага партнёрсва і распрацавала шэраг рэкамендацый па паляпшэні працэса.

## Іншыя ініцыятывы і дзеянні ў межах БНП за апошні год

### Заявы, звароты і пазіцыі БНП

За справаздачны перыяд КК і БНП прынялі шэраг дакументаў, якія прадстаўляюць пазіцыю БНП па шырокім коле пытанняў як па сітуацыі ўнутры краіны, так і ў міжнародным кантэксце, а менавіта:

- Ліст КК кіраўніку Дэлегацыі ЕС у Беларусі сп. М. Мора і кіраўніку дэпартамента Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў сп. Г. Віганду з крытыкай агучаных раней БІСД прапановаў па трэцяй фазе Еўрапейскага дыялогу па мадэрнізацыі (23.09.2013)
- Зварот БНП да удзельнікаў Форума ў Кішынёве, Нацыянальных платформаў і Кіруючага камітэту Форуму “Чаго чакаць ад пятага Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства?” (30.09.2013)
- Рэзалюцыя канферэнцыі БНП ад 04.11.2013
- Зваротная сувязь на адрас Каардынацыйнага камітэту ФГС УП “Асноўныя вынікі пятай сустрэчы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства: погляд з Беларусі” (05.11.2013)
- Каментары БНП да праекта Стратэгіі ФГС УП на 2014-2016 год (05.11.2013)
- Зварот БНП да Ўкраінскай нацыянальнай платформы “У падтрымку украінскіх арганізацыяў грамадзянскай супольнасці, якія выступаюць за далейшую еўрапейскую інтэграцыю Ўкраіны (26.11.2013)
- Зварот КК БНП да ЕС, Паўночнага савета і донараў, што фінансуюць ЕГУ “Аб канфліктнай сітуацыі ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце” (17.02.2014)
- Зварот БНП да ААН, АБСЕ, ЕС “Аб міжнародным маніторынгу сітуацыі ва Ўкраіне” (21.02.2014))
- Зварот БНП “Аб салідарнасці з народам Украіны” (24.02.2014)
- Зварот БНП да кіраўнікоў ЗША, краін ЕС, Расіі і Беларусі “Аб ваеннай інтэрвенцыі Расіі ў незалежную Ўкраіну” (03.03.2014)
- Зварот БНП “Аб падтрымцы Рэзалюцыі ААН аб тэрытарыяльнай цэласнасці Ўкраіны” (09.04.2013)
- Заява БНП ў сувязі са згубай людзей у Адэсе і ўсходняй Украіне (06.05.2014)
- Заява БНП з нагоды падпісання Рэспублікай Беларусь дамовы аб стварэнні Эўразійскага эканамічнага саюзу (ЕАЭС) (02.06.2014)
- Рэзалюцыя Канферэнцыі БНП ад 21.06.2014

Працоўная камунікацыя КК з іншымі зацікаўленымі бакамі:

- Адказ Кіруючаму камітэту ФГС УП на скаргу сп. С. Дзяжуркі (Гуманітарны мост) з нагоды несумленнага правядзення працэдуры рэкамендацый беларускіх арганізацый да ўдзелу ў Форуме ў Кішынёве (14.06.2013).
- Зварот да кіраўніцтва БІСД і ОДБ з просьбай вызначыцца наконт свайго статусу у БНП (21.06.2013 і 16.09.2013).

- Таксама ад сп. У.Мацкевіча на адрас КК быў атрыманы ліст з яго крытычнай ацэнкай стану развіцця БНП і Усходняга партнёрства і прапановамі па вырашэнні шэрагу праблемных пытанняў (17.03.2014)

Трэба адзначыць, што некаторыя з заяваў БНП сапраўды былі актыўна прыняты да ўвагі (ЕДМ, ЕГУ, Кіруючы камітэт ФГС УП, шэраг дакументаў па Ўкраіне), хоць і далека не ўсе з іх сапраўды выклікалі адпаведную рэакцыю і чакаемыя наступствы. На сёняшні момант прынцце агульных дакументаў БНП ужо стала даволі стандартнай працэдурай і добрай практыкай у межах БНП, якая дазваляе рэгулярна адносна аператыўна артыкуляваць пазіцыю грамадзянскай супольнасці па актуальных пытаннях. У той жа час гэтая добрая практыка вымагае далейшага ўдасканалення самога працэсу, у прыватнасці з магчымасцю КК ініцыяваць заявы і звароты ад імя БНП без дадатковага збору подпісаў, асабліва ў відавочных сітуацыях, што патрабуюць хуткай рэакцыі.

## Рэакцыя БНП на падзеі ва Ўкраіне

Як бачна з прыведзенага вышэй спісу прынятых БНП дакументаў, Беларуская нацыянальная платформа актыўна рэагавала на падзеі ў нашага паўднёвага суседа. Сярод прынятых 14 заяваў 6 дакументаў прысвечаныя менавіта ўкраінскім падзеям. Акрамя таго, шэраг беларускіх валанцёраў, актывістаў і праваабаронцаў рэгулярна наведвалі Ўкраіну на працягу некалькіх месяцаў з рознымі місіямі. Але варта адзначыць, што гэтыя паездкі не былі звязаныя з дзейнасцю БНП і рабіліся па ініцыятыве саміх актывістаў.

### *Круглы стол па Украіне*

14 сакавіка ў Мінску пры падтрымцы Міжнароднага кансорцыюма “ЕўраБеларусь” і КК БНП адбыўся круглы стол "Украіна сёння: што мы можам і павінны рабіць у актуальнай сітуацыі?". Асноўным выступоўцай на сустрэчы з’яўлялася Таццяна Новікава (БАЯК), пры ўдзеле шэрагу беларускіх валанцёраў, праваабаронцаў, назіральнікаў «Еўрамайдана».

Пад час дыскусіі былі закранутыя пытанні аналізу ўкраінскага майдана як новай з’явы для грамадства, яго ролі ў палітычнай сітуацыі, беларускім удзеле ва ўкраінскіх падзеях, асноўных уроках, якія можа вынесці беларуская грамадзянская супольнасць з украінскіх падзеяў, магчымага ўліку новай сітуацыі ў межах ініцыятывы Ўсходняга партнёрства і інш.

Удзельнікамі круглага стала былі прынятыя рэкамендацыі:

- Прыняць удзел ва ўшанаванні памяці загінуўшага на Майдане беларуса Міхала Жызнеўскага праз фінансавую падтрымку ідэі ўсталявання помніка.
- Стварыць у межах БНП пазіцыю спецдакладчыка па падзеях ва Ўкраіне, які будзе шчыльна супрацоўнічаць з КК па пытаннях адсочвання сітуацыі, яе прадстаўлення ўдзельнікам БНП і прапановаў хуткіх дзеянняў у выпадку неабходнасці. Круглы стол падтрымаў кандыдатуру Таццяны Новікавай у якасці такога спецдакладчыка.
- Праваабарончыя арганізацыі нашага рэгіёна зараз арганізуюць сталую Міжнародную праваабарончую місію ў Крыме. Беларускія праваабаронцы актыўна далучаныя да працэсу, але ёсць патрэба ў людзях, якія б адпавядалі пэўным крытэрам і прайшлі адпаведную падрыхтоўку. Круглы стол прапанаваў распаўсюдзіць запрашэнне да ўдзелу ў гэтай працы па больш шырокіх колах беларускай грамадзянскай супольнасці. Па пытаннях удзелу у працы Міжнароднай місіі праваабаронцаў трэба кантактаваць з Аленай Танкачовай (Lawtrend).

• На падставе досведу працы з украінскай сітуацыі прапанаваць пашырыць кола паўнамоцтваў КК дзейнічаць ад імя БНП, каб павялічыць эфектыўнасць рэакцыі з боку БНП і забяспечыць своечасовасць дзеянняў, асабліва ў тэрміновых сітуацыях.
• Паставіць пытанне пра больш пра-актыўную ролю Форума ГС УП у сітуацыях, падобных на ўкраінскую. У прыватнасці, пачаць распрацоўку і рэалізацыю ідэі Назіральнай місіі грамадзянскай супольнасці ад імя Форума ГС УП, якая магла б выкарыстоўвацца ў падобных сітуацыях надалей.
• У сітуацыі разгорнутай інфармацыйнай вайны арганізацыі грамадзянскай супольнасці Беларусі павінны забяспечыць адпаведную і аб’ектыўную інфармацыю пра сітуацыю ва Ўкраіне на сваіх інфармацыйных рэсурсах і праз публікацыі ў СМІ, каб у пэўнай ступені супрацьстаяць аднабаковай імперскай прапагандзе, якая ліецца ў тым ліку і на беларускіх грамадзянаў праз расійскія тэлевезійныя каналы.

### *Спецыяльны дакладчык БНП па Ўкраіне*

Прызначаная па выніках круглага стала ў якасці спецдакладчыка БНП па Ўкраіне Таццяна Новікава пры арганізацыйнай падтрымцы Асамблеі НДА, Міжнароднага кансорцыюма “ЕўраБеларусь” і КК прыняла ўдзел у назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі ў Кіеве 25 траўня 2014 г. Вынікам яе місіі стала справаздача па паездцы, а таксама шэраг публікацый на сайтах БНП, ЕўраБеларусі і інш.

Удзельнікі Ўкраінскай нацыянальнай платформы неаднаразова выказвалі падзяку БНП за актыўную рэакцыю на падзеі ў іх краіне і выказванне салідарнасці з грамадзянскай супольнасцю і народам Украіны ў іх імкненні да незалежнага самавызначэння ў накірунку да еўрапейскай інтэграцыі.

### Працоўная сустрэча з прадстаўнікамі Армянскай НП

На жаль, арганізацаць паўнавартасную сустрэчу з прадстаўнікамі іншых нацыянальных платформаў за межамі агульнай сустрэчы Форума пакуль не удалося па тэхнічных і фінансавых прычынах. У той жа час па ініцыятыве і пры падтрымцы Міжнароднага кансорцыюма “ЕўраБеларусь” 17-18 красавіка 2014 году ў Ерэване адбылася працоўная сустрэча невялікай групы (А. Ягораў, У.Мацкевіч, А. Танкачова, У. Вялічка) з прадстаўнікамі Армянскай нацыянальнай платформы. Мэтай сустрэчы было наладзіць стасункі, прадставіць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці сітуацыі ў нашых краінах і нацплатформ, разам ацаніць стан спраў ва Усходнім партнёрстве і наступствы ўкраінскіх падзей для рэгіёна УП, знайсці агульныя кропкі для салідарных дзеянняў у фармаце УП альбо аналагічных фарматах.

Асноўныя вынікі сустрэчы:

• Адбылося падрабязнае і грунтоўнае абмеркаванне сітуацыі і асноўных тэндэнцый развіцця грамадства, пра-і анты-еўрапейскіх рухаў у грамадствах і дзяржаўных інстытутах Арменіі і Беларусі. Для ўдзельнікаў было вельмі карысна азнаёміцца з сітуацыяй цэласна, зразумець глыбінныя прычыны і працэсы. Бакі пераканаліся, што, пры наяўнасці значных адрозненняў у развіцці Арменіі і Беларусі, асноўныя знешнія выклікі, спосабы іх уздзеяння на грамадства і верагодныя шляхі вырашэння даволі падобныя.

• Армянскія і беларускія ўдзельнікі прыйшлі да высновы аб неабходнасці рэгулярнай каардынацыі і абмену думкамі паміж сабой. Існуе відавочная патрэба ў сінхранізацыі салідарных дзеянняў і палітычных пазіцый Армянскай і Беларускай НП, якія стаяць перад аналагічнымі выклікамі (Мытны саюз, адмова палітычнага кіраўніцтва ад набліжэння да еўрапейскіх стандартаў і інш.)

• Ёсць сэнс ініцыяваць супрацоўніцтва на інтэлектуальным узроўні, арганізаваўшы адну або некалькі сустрэч краінавых экспертаў, аналітыкаў, філосафаў, палітолагаў, якія працуюць над праблематыкай грамадска-палітычнага развіцця. Для гэтага ў нашых краінах ёсць відавочны патэнцыял і магчымасці. Таксама мае сэнс ініцыяванне праграмы ўзаемных візітаў груп грамадзянскай супольнасці адзін да аднаго для ўсталявання больш цесных адносін і супрацоўніцтва.

• Магчымае сумеснае прасоўванне новага бачання Усходняга партнёрства і Форуму грамадзянскай супольнасці як яго складовай часткі.

## Высновы, рэкамендацыі, прапановы: перспектывы і выклікі для далейшай дзейнасці БНП

Развіцце Беларускай нацыянальнай платформы сутыкаецца з шэрагам знешніх і унутраных выклікаў. Асноўныя з іх палягаюць у трох вымярэннях: агульныя выклікі Усходняга парнерства, унутранная сітуацыя ў Беларусі і стан актуыўнасці самой Беларускай нацыянальнай платформы:

### Усходняе парнёрства

На сенняшні дзень ініцыятыва Ўсходняга парнёрства знаходзіцца ў відавочным крызісе. Пазытыўны імпульс трансфармацыяў кранаў УП адпаведна з еўрапейскай мадэллю, што быў нададзены Ўсходнім парнерствам, сутыкнуўся з некалькімі супярэчнасцямі.

А) Супрадзеянне Расіі і яе вайсковая агрэсія у рэгіене падвысілі кошты супрацоўніцтва нашых краінаў з ЕС і справакавалі працяглы палітычны крызіс ва Ўкраіне, а таксама змену геапалітычнага курсу Арменіі. Усходняе парнёрства на сёняшні час не мае адпаведных інструментаў супрацьдзеяння расійскай палітыцы ў рэгіене.

Б) Арыентацыя УП ў асноўным на супрацоўніцтва з дзяржавамі і адаптацыю апошнімі нормаў еўрапейскага заканадаўства пры ігнараванні ўнутранага палітычнага кантэксту краінаў-парнераў паказала сваю выразную абмежаванасць. Незацікаўленыя ў трансфармацыях дзяржаўныя эліты лёгка сімулююць працэсс рэформаў без ініцыявання сутнасных зменаў. Уся падрыхтоўчая праца па рэформах, як паказвае досвед Украіны і Арменіі, хутка можа быць павернутая ў цалкам адваротным напрамку.

В) Пры дэклараванні выключнай важнасці ўцягвання ў трансфармацыйны працэс грамадзянскай супольнасці, ЕС хутчэй бюракратызуе і фармалізуе ўдзел грамадзянскай супольнасці ў ініцыятыве УП. Акцэнтуючы ўвагу на дзяржаўных інстытуцыях, ЕС стварае пэўныя перашкоды для больш шырокага ўваходу грамадства ў палітычны працэс. Парадаксальнасць гэтага падыхода заключаецца ў тым, што гэтым ЕС адштурхоўвае найбольш еўрапеізаваную частку грамадства краінаў-партнраў. Пры гэтым, як паказвае досвед Украіны, менавіта грамадства і грамадзянская супольнасць ёсць найгалоўнейшымі актарамі еўрапейскіх трансфармацыяў.

Г) Шматбаковае вымярэнне палітыкі УП стаіць перад выклікам маргіналізацыі краінаў-аўтсайдэраў у працэсах сбліжэння з ЕС (Арменія, Азербайджан, Беларусь), што падрывае цэласнасць гэтай рэгіянальнай ініцыятывы.

### Унутраная сітуацыя ў Беларусі

Неспрыяльныя ўмовы для развіцця грамадзянскай супольнасці ўнутры краіны фактычна выштурхоўваюць яе на перыферыю грамадска-палітычнага жыцця. Каб мець магчымасць уплыву на хоць якія значныя для краіны рашэнні, грамадзянская супольнасць мусіць найперш змяніць самі ўмовы свайго існавання. Першаснае пытанне – гэта палітычныя трансфармацыі і лібералізацыя палітычнага рэжыму, што патрабуе

больш актыўнай палітычнай ролі грамадзянскай супольнасці. У той жа момант сама грамадзянская супольнасць Беларусі відавочна не гатовая да прыняцца на сябе такой місіі.

Сярод небяспечных тендэнцый апошняга перыяду ўвагі і дзеяння патрабабуе істотнае зніжэнне сярод грамадзянаў колькасці прыхільнікаў пра-еўрапейскага развіцця Беларусі і рост пра-расейскіх настрояў у беларускім грамадстве (у адпаведнасці з апошнімі сацыялагічнымі дадзенымі А.П. Вардамацкага), а таксама інфармацыйная вайна вакол Украіны, якая негатыўна адбіваецца, у тым ліку, і на беларускім грамадстве.

У бліжэйшы час таксама набліжаецца новая так званая “электаральная фаза” – прэзідэнцкія “выбары” 2015 года. З улікам абсалютнай адсутнасці ўмоваў для правядзення ў краіне сапраўдных выбараў БНП было б важна вызначыцца і заняць дакладную пазіцыю з адпаведнымі паводзінамі, заявамі і дзеяннямі датычна стаўлення да кампані 2015 года.

## Актуальны стан Беларускай нацыянальнай платформы

Беларуская нацыянальная платформа адбылася як камунікатыўная пляцоўка для арганізацыяў грамадзянскай супольнасці, але засталася вельмі абмежаванай у сэнсе актыўнага грамадска-палітычнага актара.За апошні год стала відавочным, што нягледзячы на шматлікую колькасць дзеянняў і малых крокаў, палітычна і стратэгічна БНП адчувае не сабе стагнацыйныя працэсы і губляе свае пазіцыі у стасунках з зацікаўленымі бакамі ў межах УП. Прычыны гэтага палягаюць, па-першае, ў вельмі нізкай ініцыятыўнасці сябраў Нацыянальнай платформы, якія па-большасці не імкнуцца да запуску супольных ініцыятываў і абмяжоўваюцца сваім вузкім парадкам дня. Па-другое, гэта праблема звязаная з фармальнымі перарашкодамі і завужэннем прасторы для дзейнасці БНП і з боку дзяржавы, і збоку ЕС і буйных міжнародных актараў (Савет Еўропы, ААН). Невырашанасць шэрагу пытанняў унутранага будаўніцтва і развіцця БНП папярэдняга перыяду стымулюе маргінальнасць, не дазваляе актыўна рухацца наперад ва ўмацаванні яе ролі і варматаў дзейнасці.

## Прыарытэты

У сувязі з гэтымі выклікамі Беларуская нацыянальная платформа павінна:

1. На бліжэйшую перспектыву стаць кропкай прыцягнення і супрацоўніцтва пра-еўрапейскіх групаў у межах грамадзянскай супольнасці, прапануючы грамадзянам бачную альтэрнатыву развіцця Беларусі ў еўрапейскім вектары.

2. Ініцыяваць працэсс пераасэнсавання Ўсходняга парнёрства разам з партнерамі па грамадзянскай супольнасці краінаў УП, забяспечыць узгадненне і сумеснае прасоўванне агульнага бачання ў дыялогу з ЕС і іншымі зацікаўленымі бакамі.

3. Усталяваць больш шчыльны фармат кааперацыі з Нацыянальнымі платформамі краінаў УП.

4. Актывізаваць сваі высілкі па уваходу ў працэсс еўрапейска-беларускага ўзаемадзення (праз, як найменш, маніторынг буйных праектаў і праграм супрацоўніцтва).

5. Вярнуцца да асноваў канцэпцыі развіцця БНП, прынятай 16 лістапада 2011 г., надаўшы большы дынамізм і эфектыўнасць яе дзеянням, перагледзець канцэпцыю ў адпаведнасці з актуальнымі задачамі на 2015-2017 гг.

6. Забяспечыць з улікам існуючых знешніх і ўнутраных выклікаў змястоўнае супрацоўніцтва ўдзельнікаў БНП у межах найбольш прыарытэтных Нацыянальных праграм у інтарэсах падтрымкі пра-еўрапейскага вектару развіцця.